Источник: "Беларуская думка" - №8, 2017-08-28



# Служэнне Богу праз служэнне чалавеку

**Чалавек эпохі Адраджэння – Францыск Скарына – сёння адна з самых папулярных гістарычных асоб Беларусі. Уражваюць яго талент і ўніверсальнасць: медык, перакладчык, пісьменнік, выдавец, асветнік, бібліеіст, філосаф, паэт, мастак, прыродазнавец-садоўнік, і, зразумела, легендарны ўсходнеславянскі першадрукар. Між тым дакладна невядома, як жа фарміравалася асветніцкая мэта Ф. Скарыны, чаму яго выданні ўпрыгожаны вельмі сімвалічнымі, на думку некаторых даследчыкаў, гравюрамі. Незвычайным лічыцца і тое, што некаторыя кнігі Бібліі змяшчаюць аўтарскі партрэт Скарыны.**

**Пра Фрацыска Скарыну напісана не адна сотня навуковых прац, але цікавасць да гэтай асобы з цягам часу не змяншаецца. Можа таму, што за імем вялікага гуманіста цягнецца шлейф міфаў і загадак? Менавіта аб гэтым наша размова з дырэктарам Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі, доктарам гістарычных навук Аляксандрам ГРУШАЙ і загадчыкам аддзела спецыяльных гістарычных навук і інфармацыйна-аналітычнай работы Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдатам гістарычных навук, дацэнтам Аляксеем ШАЛАНДАЙ.**

**— Не сакрэт, што, нягледзячы на актыўныя даследаванні гісторыкамі скарынаўскай спадчыны, у ёй застаецца яшчэ шмат белых плям. А якім жа на самай справе быў Францыск Скарына? Што мы пра яго ведаем дакладна, а пра што толькі здагадваемся?**

А. ГРУША: Аб гэтым гістарычным дзеячы мы ведаем значна больш, чым аб кім-небудзь з ліку яго суайчыннікаў і сучаснікаў. А такой колькасці навуковых публікацый, прысвечаных Скарыну, яго біяграфіі, не ўдастоена ніводная з асоб мінулага Беларусі эпохі Сярэднявечча і ранняга Новага часу, ды нават не толькі гэтай эпохі. У беларускай гістарыяграфіі да Скарыны заўсёды ёсць цікавасць і яна звычайна рэзка ўзрастае па меры набліжэння юбілейных дат, якія звязаны з яго жыццём і справай. Калі ж існуе такая пільная ўвага да асобы чалавека з даўняга мінулага, то яго вобраз заўжды будзе атаясамлівацца з загадкамі ды таямніцамі.

А чаго мы не ведаем пра Скарыну? На гэта пытанне я адказаў бы наступным чынам. Мы дакладна не ведаем аб матывацыі яго дзейнасці, менавіта аб тым, што прымусіла яго заняцца справай перакладу кніг Бібліі і іх выданнем, што ім кіравала ў гэтай справе, задавала актыўнасць? Была гэта дзейнасць звязана з асветніцтвам ці з імкненнем да шырокай вядомасці, бессмяротнай славы? Альбо ўсё тлумачыцца яго жаданнем матэрыяльнага прыбытку, які можна было атрымаць рэалізоўваючы кнігі? Чым менавіта?

У 1920-я гады польскі гісторык Генрых Лаўмяньскі, думка якога не асабліва вядома ў нацыянальнай гістарыяграфіі, сцвярджаў, што друкарня Скарыны была перш за ўсё даходным прадпрыемствам, кіраваўся першадрукар матэрыяльнымі – «купецкімі», а не сацыяльнымі матывамі і ні ў якім разе не быў змагаром за асвету народа.

Так, неабходна прызнаць, што і сапраўды кнігавыдавецкая дзейнасць Ф. Скарыны не магла не мець камерцыйнага характару. Выдадзеныя ім кнігі прызначаліся для продажу, а не для бясплатнай раздачы. Сучасныя даследчыкі ўказваюць на высокія паліграфічныя і мастацка-выяўленчыя якасці кніг Скарыны, на тое, што ў сваіх прадмовах і пасляслоўях ён выкарыстоўваў розныя моўныя, літаратурныя і рытарычныя сродкі і прыёмы. Аднак гэта можна разглядаць як маркетынгавы ход і




Сняжана Міхайлоўская. Служэнне Богу праз служэнне чалавеку

Источник: "Беларуская думка" - №8, 2017-08-28




Аляксандр ГРУША


Аляксей ШАЛАНДА

своеасаблівыя літаратурныя прыёмы, якія павінны былі садзейнічаць поспеху кнігавыдавецкага бізнес-праекта.

**– Чаму ж тады Скарына заняўся справай перакладу кніг Бібліі?**

А. ГРУША: Даследчыкі неаднаразова звярталі ўвагу на адзін пасаж у літаратурных творах Скарыны. У прадмове да «Дзеянняў святых апосталаў» (1525) Скарына піша пра евангеліста Луку, што той быў у лекарскіх навуках доктарам – лекарам цялесным. Паступова ўсвядоміўшы, што ўсе цялесныя рэчы марныя і мінучыя, ён пажадаў стаць лекарам чалавечых душ, створаных па вобразе і падабенстве Божым. Ён зразумеў, што чалавек жыве не толькі хлебам і лекамі, але больш словам, якое зыходзіць з вуснаў Божых – словам, з дапамогай якога ўсталяваліся нябёсы, была заснавана Зямля, абазначаны межы водаў, створаны ўсе бачныя і нябачныя мінучыя рэчы. Выкажам меркаванне, што Скарына, мадэлюючы вобраз Лукі і паведамляючы аб яго выбары, адлюстраваў у літаратурнай форме матыў уласнага выбару (паралель у вобразах Лукі і Скарыны відавочная: абодва – дактары ў лекарскіх навуках, абодва звярнуліся да праслаўлення Божага слова, абодва літаратары, якіх аб'ядноўвае схільнасць да высокага стылю, дакладнага і грунтоўнага апавядання). Такім чынам, можна зрабіць вывад, што, як і евангеліст Лука, Францыск Скарына стаў лекарам «душ чалавечых», абраўшы такую форму настаўніцтва і асветніцтва, як распаўсюджванне Свяшчэннага Пісання.

**– Адкуль жа пайшлі вытокі яго асветніцкай мэты? Магчыма, ён быў знаёмы з друкаванымі кнігамі яшчэ да паступлення ў Кракаўскую акадэмію? Калі так, ці вядома, якія з іх маглі найбольш уразіць юнага Францыска?**

А. ГРУША: На падставе папярэдняга меркавання можна выказаць яшчэ адну думку пра жыццёвы і творчы этапы, калі Скарына задумаў заняцца перакладам Свяшчэннага Пісання, яго выданнем і распаўсюджваннем. Верагодна, ідэя ўзнікла пасля 1512 года – тады Скарына атрымаў у Падуанскім універсітэце званне доктара медыцыны.

Ажыццяўленню гэтай задумы папярэднічалі інтэлектуальныя і духоўныя пошукі Скарыны, якія стымуляваліся яго навучаннем у Кракаўскім універсітэце, працягам адукацыі, штудзіраваннем літаратуры, зносінамі з інтэлектуаламі. Перыяд пасля Кракава і да 1512 года, на наш погляд, быў вырашальным у яго жыцці. У гэты час крышталізаваліся сацыяльныя каштоўнасці Скарыны, фарміраваліся ўяўленні аб той сацыяльнай групе, меркаванне якой для яго было важным і аўтарытэтным. Магчыма, менавіта ў гэты час вызначыліся галоўныя жыццёвыя матывы Скарыны: пазнанне Бога, сябе і чалавека. Тады ж сфарміраваліся і яго мэты – служэнне Богу праз служэнне чалавеку.

Я лічу, што Скарына ў сваёй дзейнасці быў матываваны філантропіяй, чалавекалюбствам. Але як ён мог праявіць свой клопат аб людзях, калі быў чалавекам бедным (як называюць яго ў адной крыніцы), не здольным аказваць дапамогу тым, хто меў у ёй патрэбу, ні ўладай, ні грашамі, ні ўплывам? І ён выкарыстаў свае веды.

Насуперак думцы Г. Лаўмяньскага, ёсць падставы лічыць: для Скарыны матэрыяльны матыў не быў ключавым, найбольш важным у дзейнасці. Наш зямляк абраў нетрадыцыйны спосаб выдання кніг – друк, надаў ім нетрадыцыйныя друкарска-мастацкія формы. І гэта пры тым, што яго выданні былі разлічаны на грамадства, якое кіравалася каштоўнасцямі, нормамі і катэгорыямі «даўніны», гэта значыць – дзейнічаў прынцып строгага захавання ўстаноўленых правілаў і ўзораў. Рызыка камерцыйнага пачынання Скарыны заключалася ў тым, што выдадзеныя ім друкаваным, а не рукапісным спосабам кнігі, былі і аформлены непрывычна, нетрадыцыйна, маглі выклікаць насцярожанасць і нават непрыязнасць, асабліва ў дэмакратычнай часткі грамадства, якой, між іншым, ён уласна гэтыя кнігі і адрасаваў.

А. ШАЛАНДА: Не памылюся, калі адзначу, што гэты «асветніцкі ключ» ляжыць найперш ва ўніверсітэцкай адукацыі і ўплывах на Скарыну кракаўскіх ака-



Сняжана Міхайлоўская. Служэнне Богу праз служэнне чалавеку

Источник: "Беларуская думка" - №8, 2017-08-28



дэмічных выкладчыкаў, а таксама тагачаснага інтэлектуальнага асяроддзя польскай сталіцы. Але на шлях атрымання адукацыі ў Кракаўскім універсітэце яго маглі накіраваць толькі бацька Лука Скарына і першыя настаўнікі.

Наконт знаёмства Скарыны з друкаванымі кнігамі можна дапусціць, што гэта здарылася яшчэ ў Полацку, куды мясцовыя купцы маглі прывезці кірылічныя кнігі, напрыклад, Швайпольта Фіёля. У 1491–1493 гадах ён у Кракаве выдаў чатыры праваслаўныя літургічныя кнігі – «Актоіх», «Часаслоў», «Трыёдзь посную» і «Трыёдзь каляровую». Гэтыя кнігі маглі аказаць на маладога Скарыну пэўнае ўражанне.

**А. ГРУША:** Безумоўна, дакладна мы не ведаем, ці быў знаёмы Скарына з друкаванымі кнігамі да паступлення ў Кракаўскую акадэмію. І не так важна, якія – друкаваныя ці рукапісныя выданні чытаў юны Францыск. Важна, што ён чытаў. Сярод кніг былі і тыя, якія захоўваліся ў Сафійскім саборы ў Полацку. Уплыў на яго, бясспрэчна, аказала Свяшчэннае Пісанне, пераклад і выданне якога стане ў далейшым адной з яго галоўных місій. На Скарыну таксама моцна паўплывалі творчасць і дзейнасць рэлігійнага пісьменніка Еранім Стрыдонскага (жыў у IV–V стагоддзях), які пераклаў Біблію на лацінскую мову. Скарына лічыў сябе паслядоўнікам Еранім.

**– Ігнат Дварчанін у сваёй грунтоўнай манаграфіі «Францішак Скарына як культурны дзеяч і гуманіст на беларускай ніве» даказвае, што першадрукар быў католікам, паводле П. Уладзімірава ён – праваслаўны... Напэўна, даследчыкі проста прадузятыя і імкнуцца аднесці Скарыну хто да адной, хто да другой канфесіі?**

**А. ГРУША:** Я не лічу, што ва ўсіх выпадках вучоныя былі прадузятымі. Так ці інакш, яны прыводзілі навуковыя аргументы на карысць канфесійнай прыналежнасці Скарыны. На маю думку, ён быў католікам. І гэта, апрача іншага, сур'ёзна пацвярджае яго імя – Францыск. Як вынікае з адной вельмі каштоўнай крыніцы па антрапаніміцы ВКЛ – «Перапісу войска Вялікага Княства Літоўскага 1528 года», што змяшчае пералік ваеннаабавязаных гэтай дзяржавы, імя Францыск, імя па бацьку, утворанае ад гэтага імя, мелі жыхары літоўскіх рэгіёнаў і Падляшша, дзе дамінавала каталіцкае насельніцтва. Яно зусім не сустракаецца там, дзе пераважалі праваслаўныя.

**– Не супадаюць думкі вучоных і наконт гравюр, якімі насычаны скарынаўскія выданні. Яны сапраўды служылі толькі мастацкім аздабленнем да друкаваных знакаў ці ў іх іншае прызначэнне: так бы мовіць – зашыфраваная графічная перадача ведаў?**

**А. ШАЛАНДА:** Сапраўды, даследчыкі творчасці Ф. Скарыны даўно звярнулі ўвагу на вялікую насычанасць пражскай «Бібліі рускай» гравюрнымі матэрыяламі. Функцыю некаторых з іх раскрыў сам першадрукар: для лепшага разумення зместу сваіх кніг ён размясціў цэлую серыю гравюр з узорамі рыз, стала, скрыні і інш. Некаторыя гравюрныя віньеткі і застаўкі мелі толькі дэкаратыўны характар. Аднак шэраг іншых, так званых геральдычных гравюр Скарыны праз гербы і гербавыя выявы нёс тагачасным чытачам дадатковую інфармацыю пра гістарычныя падзеі ў Еўропе і на беларускіх землях Вялікага Княства Літоўскага.



◀ Мастак-гравёр за працай. Майстар Ёст Аман. 1568 год





Сняжана Міхайлоўская. Служэнне Богу праз служэнне чалавеку

Источник: "Беларуская думка" - №8, 2017-08-28





**– Лічыцца, што шмат загадак мае партрэт Ф. Скарыны, у якім у алегарычна-сімвалічнай форме выяўляюцца і яго біяграфічныя даныя, і філасофскае крэда. Адмысловае сімвалічнае значэнне маюць прадметы, якімі ён сябе там акружыў.**

А. ГРУША: Партрэт Скарыны – гэта ў большай ступені сродак яго самапазіцыянавання, самарэпрэзентацыі, самаапісання. Такім сродкам былі і самі кнігі – арыгінальныя па сваім знешнім выглядзе і спосабе выдання, з указаннем, што яны выдадзены Скарынам, і змест яго літаратурных твораў – прадмоў і пасляслоўяў, у якіх ён падкрэсліваў свае разнастайныя высокія, прэстыжныя і аўтарытэтныя статусы: «вучоны муж», «доктар», «у лекарстве доктар», «у лекарскіх навуках доктар», «у навуках вызваленых і ў лекарстве доктар», «у науках і ў лекарстве настаўнік» і г.д.

Праз партрэт Скарына фарміраваў свой аўтарытэт перакладчыка і выдаўца, паведамляючы пра сябе тое ж самае, што і ва згаданых прадмовах і пасляслоўях, толькі рабіў гэта пры дапамозе візуальных вобразаў. Дарэчы, нідзе – ні ў тэкстах сваіх літаратурных твораў, ні на партрэце – Ф. Скарына не пазіцыяніруе сябе як друкара, як яго сёння прадстаўляе навуковая і навукова-папулярная літаратура, а ствараe вобраз вучонага, перакладчыка і пісьменніка.

А. ШАЛАНДА: Партрэт Скарыны сапраўды нараджае розныя контрверсіі ў даследчыкаў, якія імкнуцца разгадаць яго таямніцы. Аднак прыпісваць прадметам, якімі акружыў сябе першадрукар, нейкі глыбокі патаемны сэнс, я лічу, няма падстаў. Рэчы гэтыя самыя звычайныя і іх можна знайсці, у тым ліку армілярную сферу, на партрэтах іншых еўрапейскіх інтэлектуалаў эпохі Адраджэння і не толькі. На мой погляд, важна іншае: партрэт Скарыны – свецкі па сваім характары, насычаны геральдыкай, якая дакладна адлюстроўвае радавод і паходжанне першадрукара.

**– Вось і дабраліся да самага цікавага... Дык паўмесяц, які злучаны з сонцам – гэта знак мастака Скарыны, герб роду або ў гэтай выявы свой нейкі сэнс? Дарэчы, паводле адной з версій, прапанаваных навукоўцамі, малюнак звязаны з сонечнымі зацьменнямі, якія можна было назіраць у Полацку. Што Вы думаеце наконт гэтага?**

А. ШАЛАНДА: Паўмесяц злучаны з сонцам – гэта не родавы, а асабісты герб Францішка Скарыны, або герб набілітаванага мешчаніна. Трэба катэгарычна адкінуць усе іншыя яго інтэрпрэтацыі – друкарскі сыгнет, экслібрыс, выдавецкая марка і інш. У «Біблії» ёсць поўная яго выява на адной з заставак, якая не пакідае месца для нейкіх розначытанняў. Іншае пытанне: чаму паўмесяц і сонца менавіта ў такой кампазіцыі трапілі ў скарынаўскі герб? Іх «злучанасць» скарыназнаўцы трактавалі як зацьменне, а далей шукалі ўжо яму нейкае тлумачэнне ў сувязі са Скарынам, нават з датай яго нараджэння. Але ў еўрапейскай геральдыцы выявы паўмесяца і сонца былі вельмі папулярныя. Каб пазбегнуць паўтораў, яны маглі мець самыя розныя камбінацыі размяшчэння на гербавай тарчы. Таму, мяркую, што злучэнне паўмесяца і сонца ў гербе Скарыны было тэхнічным. Гэты знак сведчыў пра яго «прафесію», бо выводзіўся са скарынаўскага тытула доктара «в науках вызволеных», а менавіта ад адной са спецыяльнасцей – астраноміі. Не сакрэт, што апошняй наш першадрукар асабліва захапляўся.

**– Неаднаразова ў скарынаўскіх выданнях сустракаюцца такія знакі, як трыкутнік і трапецыя. Калі перавярнуць трапецыю, атрымліваецца «ружа і крыж», такім чынам, не выключаецца, што наш асветнік быў розенкрэйцэрам. Наколькі рэальныя думкі аб прыналежнасці Ф. Скарыны да таемных суполак?**

А. ШАЛАНДА: Я не прыхільнік канспіралагічных тэорый. Гэтыя версіі наўрад ці могуць пераканаць каго-небудзь. Упэўнены, што «трапецыю» і «трохкутнік» трэба разглядаць з пазіцый геральдыкі як спецыяльнай гістарычнай навукі. Тады ўсё становіцца на свае месцы і Скарына

Источник: "Беларуская думка" - №8, 2017-08-28



of the Renaissance, the younger ones—

ператтвараецца ў таго, кім ён быў на самай справе – у еўрапейскага гуманіста эпохі ранняга Адраджэння. Як чалавек адукаваны і амбіцыйны Скарына выйшаў за рамкі свайго мяшчанскага паходжання. Такія як ён, дактары, фарміравалі новую свецкую па сваім характары сацыяльную плынь ці групу інтэлектуалаў («вучоных мужоў»), якіх ахвотна рэкрутавалі сабе на сакратарскую службу каралі, князі, біскупы і магнаты.

**– Цікава, ці належыць Францыску Скарыну аўтарства гравюр у яго кнігах? Так, лічыцца, што таленавіты чалавек таленавіты ва ўсім. Але ж ці мог наш знакаміты зямляк быць яшчэ і мастаком?**

А. ГРУША: Мы так узносім заслугі Скарыны, што гатовы прыпісаць яму многае. На думку спецыялістаў, якія займаліся і займаюцца вывучэннем гравюр Скарыны, гравюры яго пражскіх выданняў былі вынікам творчай садружнасці выдаўца, рысавальшчыка, які ствараў кампазіцыю і вобразы, і гравёра-рэзчыка, які рыхтаваў клішэ. Прычым рысавальшчыкаў і гравёраў было даволі шмат. Скарыне мог належаць выбар сюжэта, напрыклад, ён мог апісаць кампазіцыю, падказаць рысавальшчыку важныя дэталі, накідаць эскіз. У гэтай сумеснай дзейнасці Скарыну належала галоўная роля. Але сам ён не рабіў малюнкаў і не рыхтаваў ксілаграфічныя дошкі. Так лічыў беларускі даследчык В. Шматаў.

**– Якія яшчэ таямніцы захоўвае скарынаўская гравюрная спадчына? Што можна сказаць аб новым прачытанні «старажытных» крыніц? Якія даследаванні на конт гэтага праводзіліся навукоўцамі?**

А. ШАЛАНДА: Як бы дзіўна гэта ні прагучала, але даследаванне гравюр Скарыны толькі пачынаецца. Гэта ні ў ніякім разе не прыніжае працы ранейшых нашых і замежных даследчыкаў. Яны падрыхтавалі грунтоўную глебу для новага этапу вывучэння ўсёй скарынаўскай спадчыны. Але навука не стаіць на месцы. У юбілейны год, як у Беларусі, так і за яе межамі, ўжо з'явілася вялікая колькасць кніг і артыкулаў, прысвечаных 500-годдзю беларускага кнігадрукавання. Аднак да канца года яшчэ застаецца час, значыць, будуць яшчэ публікацыі.

Інстытут гісторыі НАН Беларусі рыхтуе новае выданне крыніц, звязаных з жыццём і дзейнасцю Скарыны, у якім будуць змешчаны і новыя знаходкі з архіваў Ватыкана, Польшчы, Чэхіі. Іх няшмат, але кожная крыніца набліжае да нас постаць Скарыны. Так, у жніўні – верасні ў выдавецкім доме «Беларуская навука» павінна выйсці з друку мая кніга «Код Францішка Скарыны», дзе галоўная ўвага будзе звернута якраз на геральдычныя матэрыялы ў пражскіх і віленскіх выданнях беларускага перша-



▲ Гравюрная застаўка «Бог у раі» з кнігі «Быццё». Майстар AWE. 1519 год



▼ «Благаславенне». Гравюра з тытульнага ліста кнігі «Прамудрасць Божая». Прага, 1518 год. Па меркаванні даследчыкаў, Францыск Скарына намаляваў сябе на гэтай гравюры ў выглядзе маладога чалавека, які стаіць на каленях

Источник: "Беларуская думка" - №8, 2017-08-28



друкара і іх расшыфроўку. Спадзяюся, што чытачы атрымаюць асалоду ад вандроўкі ў свет скарынаўскай геральдыкі. Яе прачытанне дасць магчымасць раскрыць зашыфраваную ў гравюрах інфармацыю пра канкрэтныя падзеі айчыннай і еўрапейскай гісторыі – Венскі кангрэс 1515 года, уступленне на чэшскі трон караля Людвіка Ягелончыка, страту ВКЛ Смаленска ў 1514 годзе, вайну 1512–1522 гадоў паміж ВКЛ і Масковіяй і інш. Раскрываецца таксама такі феномен беларускай гісторыі і культуры, як мяшчанская геральдыка ВКЛ у канцы XV–XVI стагоддзяў. Чытач даведаецца пра яшчэ аднаго паплечніка першадрукара – таямнічага майстра AWE і ўбачыць яшчэ адную партрэтную выяву Скарыны.

А. ГРУША: Варта дадаць, што Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі выпусціла сёлета ў выдавецкім доме «Беларуская навука» зборнік прац «Францыск Скарына: асоба, дзейнасць, спадчына». Аўтары прадстаўляюць не толькі розныя краіны – Беларусь, Украіну, Літву, Чехію, Францыю, але і розныя галіны гуманітарных ведаў, навуковыя школы і інтарэсы, розныя падыходы ў даследаваннях. У навуковых артыкулах разгледжаны перадумовы дзейнасці Скарыны, тыпы і моўная мадэль яго перакладаў кніг Бібліі, значэнне асобных сімвалічных выяў Скарыны, месцазнаходжанне яго друкарні ў Празе, паходжанне інфармацыі аб магчымай паездцы Скарыны ў Маскву, іншыя пытанні, апублікаваны дакументы, якія праліваюць святло на фарміраванне культурных практык, звязаных з ушанoўваннем асобы Францыска Скарыны ў Беларусі ў ХХ стагоддзі, і ролі ў гэтым Інстытута беларускай культуры, а ў далейшым Акадэміі навук БССР.

**– У розных крыніцах прыводзяцца супярэчлівыя даныя наконт таго, колькі кніг было выдадзена ў Празе Ф. Скарынам. Лічбы гэтыя вагаюцца ад 22 да 30...**

А. ГРУША: Тут няма супярэчнасцей. Колькасць залежыць ад таго, што той ці іншы даследчык кладзе ў аснову падліку: асобныя кнігі Бібліі ці выданні, якія маглі ўключаць у сабе некалькі кніг. Напрыклад, у агульны лік выдадзеных кніг можна ўключыць чатыры асобныя кнігі Царстваў. Але іх можна разглядаць і як адно выданне: так робіць Я. Неміроўскі (на той падставе, што яны маюць паслядоўную і скразную нумарацыю аркушаў). Пяць выданняў 1519 года – кнігі «Быццё», «Выхад», «Левіт», «Лічбы» і «Другі закон» таксама можна палічыць як адно выданне, бо ўсе яны ўзыходзяць да Пяцікніжжа. На думку даследчыкаў, Скарына мог выдаць у Празе і іншыя кнігі Старога Запавета, экзэмпляры якіх не захаваліся да нашых дзён.

**– Смерць жонкі і аднаго з сыноў, турма, спаленыя кнігі – на долю Францыска Скарыны выпала шмат выпрабаванняў. Навукоўцы дагэтуль спрабуюць разблытаць мудрагелістыя вузлы яго біяграфіі, якая падобна на сярэдневяковы дэтэктыў. Невядома і тое, калі і дзе Скарына пахаваны. Паводле некаторых крыніц, ён памёр у 1552 годзе, калі яму было не больш за 60 гадоў. А што наконт гэтага гаворыць афіцыйная навука?**

А. ГРУША: Ёсць дзве думкі адносна даты смерці Францыска Скарыны. Згодна з першай, Скарына памёр незадоўга да чэрвеня 1541 года, згодна з другой – у канцы 1551 – самым пачатку 1552 года. Апошняя дата, думаецца, найбольш верагодная. Бо ў студзені 1552 года сын Францыска Скарыны Сімяон атрымаў ад чэшскага караля грамату, якая абавязвала выдаць яму маёмасць памерлага бацькі.

▼ Гравюрная застаўка «Поўны герб Скарыны» ў кнізе «Песня песням». Майстар AWE. 1518 год



Сняжана Міхайлоўская. Служэнне Богу праз служэнне чалавеку

Источник: "Беларуская думка" - №8, 2017-08-28



**– Што вядома пра нашчадкаў Ф. Скарыны? Дзе яны могуць пражываць?**

А. ГРУША: Нашчадкі Францыска Скарыны могуць жыць у Чэхіі, у Польшчы і ў іншых краінах. Але пра гэтых нашчадкаў дакладных звестак няма. Жывуць носьбіты прозвішча Скарына (дарэчы, такія носьбіты ёсць і ў Беларусі). Аднак адсутнічаюць дакладныя даныя аб тым, ці гэта сапраўды спадчыннікі асветніка. Дарэчы, адзін сын Францыска, які дажыў да старасці, не ўспадкаеміў прозвішча бацькі. Яго звалі Сімяон Рус. Хутчэй за ўсё, нашчадкаў Скарыны трэба шукаць менавіта пад гэтым ці падобнымі прозвішчамі.

**– Чым, на Ваш погляд, выклікана такая вялікая цікавасць да асобы Францыска Скарыны? Дарэчы, і міфы, што існуюць у грамадстве, толькі пацвярджаюць, што яна ёсць...**

А. ГРУША: Цікавасць да асобы Францыска Скарыны абумоўлена ў першую чаргу тым, што яго вобраз з'яўляецца часткай калектыўнай памяці беларусаў. Ён уведзены ў культурны дыскурс, ператвораны ў сімвал нацыянальных каштоўнасцей, асэнсоўваецца і перажываецца ў сувязі з грамадскімі мэтамі і задачамі, планамі краіны на будучае. У розныя часы існавання БССР, незалежнай Беларусі вобраз Скарыны служыў для абгрунтавання сацыяльных пераўтварэнняў, нацыянальнага і дзяржаўнага будаўніцтва, кансалідацыі грамадства, культурнага адраджэння, выхавання патрыятызму, дыялогу Беларусі з іншымі краінамі, зацвярджэння адзінства беларускай і еўрапейскай культур і г.д. У 1990 годзе вобраз Скарыны нават пераўтварыўся ў палітычны рэсурс, сімвал імкнення Беларусі да нацыянальнага адраджэння, дзяржаўнага суверынітэту і незалежнасці. Да працэсу стварэння, падтрымання і стымулявання калектыўнай памяці пра Скарыну былі прыцягнуты таксама і вучоныя, якія адначасова задавольвалі і свае прафесійныя інтарэсы.

**– З чаго, на Вашу думку, складаецца місія Францыска Скарыны?**

А. ГРУША: Гэтых місій было некалькі. Па-першае, гэта вернасць свайму прызванню. Для сучаснай гістарычнай антрапалагічна арыентаванай навукі Францыск Скарына цікавы як чалавек, які спрабаваў зацвердзіць суверэнітэт сваёй творчай асобы. Жыццёвы шлях яго не быў тыповым. Сацыяльная традыцыя патрабавала, каб Скарына прысвяціў сябе заняткам сваіх продкаў. Ён павінен быў стаць купцом і гандляваць скурамі і мёдам, як гэта рабілі яго дзед, бацька і родны брат. Лёс беларускага першадрукара мог скласціся іншым чынам: з такімі здольнасцямі, ведамі і вопытам ён мог стаць біскупам, каралеўскім сакратаром і доктарам.

Але Скарына не зрабіў ні адміністрацыйнай, ні духоўнай кар'еры. Па ўсім відаць, ён шукаў той занятак, які лічыў важным для сябе і грамадства. Наш суайчыннік прысвяціў сябе інтэлектуальнай працы. Скарына паспрабаваў выступіць у ролі прадстаўніка новага саслоўя – саслоўя вучоных мужоў. Праз адукацыю і дзейнасць ён узняў сваё жыццё ў ранг высокага служэння.

Па-другое, прызнанне Скарынам каштоўнасці ведаў. І не настолькі важна, што гэтыя веды былі цесна звязаныя з рэлігіяй. Скарына, які лічыў, што веды могуць змяніць навакольны свет і асобу чалавека, стаў прадцечай сучасных вучоных.

Па-трэцяе, рэалізацыяй першых дзвюх місій стала публікацыя Скарынам шматтыражных біблейскіх тэкстаў, адаптаваных для чытання і засваення шырокай аўдыторыяй. Гэтыя тэксты, відавочна, адыгралі вялікую ролю ў далучэнні грамадства да гуманістычных каштоўнасцей.

Жыццёвы шлях Скарыны быў прадвызначаны прызваннем, прагай да самавыяўлення і самазацвярджэння. Скарына шукаў сябе і праз фарміраванне сваёй асобы. Бо тыя задачы, якія ён планаваў рэалізаваць праз выданне кніг Бібліі – прымнажэнне ведаў, мудрасці, добрых звычаяў, удасканаленне разуму, далучэнне да маралі, ён ставіў і перад сабой. Бясспрэчна, Францыск Скарына ўяўляў сабой новы тып асобы, які заслугоўвае самай пільнай увагі з боку вучоных.

**Размаўляла Сняжана МІХАЙЛОЎСКАЯ**






Сняжана Міхайлоўская. Служэнне Богу праз служэнне чалавеку